


# *КАБ ВЕДАЛІ*

**Пабачыла свет новая кніга публіцыстыкі, аўтар якой вядомы беларускі журналіст, празаік Ніна Аляксееўна Рыбік. Выданне «Праз гады і газетныя старонкі» *(Маладзечна, Друкарня «Перамога», 2026)* прысвечана гісторыі газеты «Астравецкая праўда» і жыццю раёна ў перыяд з 1992 па 2024 гады.**

У анатацыі сказана: *«Выданне прысвечана гісторыі газеты «Астравецкая праўда» і адлюстраванага на яе старонках жыцця Астравецкага раёна ў перыяд незалежнай Беларусі, з 1992 года па 2024-ы. Выданне з'яўляецца працягам кнігі з такой жа назвай, якая выйшла ў 2022 годзе, дзе прасочваецца гісторыя газеты і раёна з 1941 па 1991 гады. Кніга ўяўляе інтарэс для тых, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, жыццём людзей, якія працавалі ў рэдакцыі газеты і Астравецкім раёне ў гэты перыяд часу».*

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

## ПРАДМОВА

Дарагія сябры, паважаныя калегі, шаноўныя чытачы!
Лічбавыя тэхналогіі захопліваюць свет, падпарадкоўваючы сабе чалавека і яго розум. Многія з нас усё часцей задумваюцца над будучыняй друкаваных выданняў. І мы – не выключэнне. І таму пераходзім у «лічбу». Аднак не забываем пра старую добрую папяровую газету, бо яна, як і раней, для многіх з'яўляецца асноўнай крыніцай навін, а разам з тым – раённым летапісам. Бо, як сцвярджае народная прымаўка, што напісана пяром – не высечаш і сякерай. І наўрад ці знойдзецца той, хто гэта абвергне.

У 2022 годзе да 80-годдзя «Астравецкай праўды» выйшла ў свет першая частка кнігі «Праз гады і газетныя старонкі». Яшчэ да таго як рукапіс увасобіўся ў кнігу, стала зразумела, што гісторыя раённай газеты і людзей, што яе стваралі, заслугоўвае таго, каб яе ведалі не толькі тыя, хто працуе ў «раёнцы», але і іншыя.

А калі прайшла прэзентацыя выдання, і мы пачулі мноства станоўчых водгукаў і пажаданняў, яшчэ больш упэўніліся, што працавалі недарэмна і даследаванне гісторыі

газеты трэба працягваць. За гэтую справу ізноў узялася былы галоўны рэдактар «Астравецкай праўды», цяперашні карэспандэнт «раёнкі», таленавіты журналіст і пісьменнік Ніна Рыбік.

…Толькі ў казцы ўсё адбываецца па ўзмаху чароўнай палачкі. Кнігі так не пішуцца. На такую работу патрабуецца нашмат больш часу. А яшчэ цікавасці, жадання, энергіі… – усяго таго, чым якраз і валодае Ніна Аляксееўна!
Сказаць, што з сучаснай гісторыяй лягчэй?! Магчыма! Толькі паток інфармацыі быў нашмат больш і ён патрабаваў яшчэ большай працы і вывучэння.

…Вы трымаеце ў руках другую частку кнігі, прысвечанай гісторыі рэдакцыі і лёсам яе супрацоўнікаў, а таксама гісторыі раёна. І яна, як нам падаецца, таксама атрымалася цікавай і значнай.

Мы абяцалі, што сустрэнемся – і выканалі сваё абяцанне. Дзякуй за гэта таленавітай, творчай і нераўнадушнай да ўсяго, што адбываецца навокал, Ніне Рыбік.

А таксама нашым заснавальнікам – Астравецкаму раённаму выканаўчаму камітэту, Астравецкаму раённаму Савету дэпутатаў і акцыянернаму таварыству «Атамбудэкспарт» за фінансавую дапамогу ў выданні кнігі.

Усім жадаю цікавых вечароў з новай кнігай, якая пазнаёміць з астравецкімі журналістамі і нагадае гісторыю раёна за апошнія 35 гадоў.

***Алена Ярашэвіч,***
*галоўны рэдактар газеты*
*«Астравецкая праўда»*

www.pisateli.by